# РЭСУРСНЫ ЦЭНТР “ДАКРАНІСЯ ДА ВЫТОКАЎ СВАЁЙ СПАДЧЫНЫ”

**Рыжыкава Марыя Мікалаеўна,**
настаўнік музыкі вышэйшай катэгорыі
ДУА “Сярэдняя школа № 15 г. Барані”, кіраўнік рэсурснага цэнтра
“Дакраніся да вытокаў сваёй спадчыны”

***Веданне гісторыі свайго народа – праява ўнутранай культуры кожнага чалавека, чым бы ён ні займаўся ў сваім жыцці. У мінуўшчыне – вытокі, з якіх выйшаў ты, прадстаўнік, часцінка свайго народа. Наколькі глыбока ты намацаў свае карані, настолькі ты адукаваны, інтэлігентны чалавек, настолькі будзеш несці нацыянальную сваю прыналежнасць.***

***Аляксей Дудараў***

*Падмуркам для стварэння рэсурснага цэнтра з прыгожай назвай “Дакраніся да вытокаў сваёй спадчыны” ў дзяржаўнай установе адукацыі “Сярэдняя школа № 15 г. Барані” стала наяўнасць у ёй узорнага фальклорнага калектыву “Сявенька”, які вядомы як у горадзе, раёне, так і ў вобласці тым, што займаецца пастаноўкай абрадаў менавіта на матэрыяле Аршанскага рэгіёна. Тут трэба адзначыць, што гэты матэрыял збіраецца, вывучаецца, пераасэнсоўваецца і перадаецца кожнаму наступнаму пакаленню вучняў праз перайманне, з абавязковым улікам асаблівасцей выканання адзначанай мясцовасці.*

*Акрамя гэтага ў школе назапашана значная колькасць вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў розных тэхніках. Вучнямі школы сумесна з настаўнікамі выраблены два мясцовыя касцюмы мінуўшчыны. Кожны касцюм складаюць кашуля, спадніца, фартух. Тканіну на фартухі падаравала ў адной з вандровак з асабістага куфара носьбітка фальклору. Звесткі аб тым, як яны выглядалі, былі ўзяты ў музеіі “Млын” г. Оршы. Тэарытычны матэрыял аб кожнай з гэтых тэхнік сабраны і сістэматызаваны ў метадычны папкі.*

*А таксама сабрана калекцыя прадметаў быту насельніцтва Аршанскага рэгіёна канца 19 – пачатку 20 стагоддзя.*

Сярэдняя школа № 15 г. Барані старэйшая ў горадзе. Назапашаны за гады існавання вопыт у галіне выкарыстання традыцый народнай педагогікі стаў сур’ёзным падмуркам для стварэння менавіта ў ёй рэсурснага цэнтра “Дакраніся да вытокаў сваёй спадчыны”. Яго асноўная мэта – фарміраванне ўмоў для развіцця прафесійнай кампетэнтнасці настаўнікаў і фарміраванне грамадзянскай пазіцыі школьнікаў праз вывучэнне народных традыцый.

У школе існуе ўзорны фальклорны калектыў “Сявенька”, кіраўніком якога з’яўляецца В.М. Шчэрбава. Рэпертуар калектыву будуецца на матэрыяле Аршанскага рэгіёна. Вучнямі школы разам з настаўнікамі ў розныя часы сабраны багаты музычны, вусна-паэтычны, песенны матэрыял, на аснове якога пастаўлена шэраг абрадаў. Гэта “Хрэсьбіны”, “Жніво”, “Гуканне вясны”, “Масленіца”, “Каляды”, “Купалле”, “Піліпаўскія вячоркі”, “Кірмаш”.

За гады існавання рэсурсны цэнтр прыняў у сваіх сценах вялікую колькасць гасцей, сярод якіх былі як настаўнікі школ гарадоў Барані, Магілёва, Оршы са сваімі выхаванцамі, так і калегі з суседняй Расіі. Мы з задавальненнем дзелімся набытым вопытам.

У першы год работы ўсе запланаваныя сустрэчы з настаўнікамі школ горада рыхтаваліся выключна сіламі школы-гаспадыні. На іх заслухоўваліся тэарытычныя пытанні ў галіне фальклору, гучалі, акапэльныя спевы ўдзельнікаў узорнага калектыву СШ № 15 "Сявенька", выконваліся мясцовыя абрадавыя песні, побытавыя танцы, дэманстраваліся фрагменты абрадаў з мясцовымі асаблівасцямі. Тэматыка разгледжаных на пасяджэннях рэсурснага цэнтра пытанняў даволі шырокая "Традыцыйная культура і дзеці: праблемы этнавыхавання", "Традыцыі і абрады Аршаншчыны", "Асаблівасці гукавядзення ў фальклорных песнях", "Народныя рамёствы – асобая форма, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва".

Мэтай работы рэсурснага цэнтра ў першы год існавання стала сфарміраванасць адзінай інфармацыйнай прасторы, павышэнне кампетэнтнасці настаўнікаў горада ў галіне народнай творчасці, папулярызацыя розных відаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, выпрацоўка новых форм і метадаў работы, накіраваных на эфектыўнае распаўсюджванне народнай творчасці. Аднак колькасць настаўнікаў горада, якія ўдзельнічалі ў праведзеных мерапрыемствах, была, на наш погляд, недастатковай. Таму наступным крокам работы рэсурснага цэнтра стала спроба актывізаваць калег з іншых устаноў адукацыі з мэтай абмену вопытам у галіне народнай творчасці і фарміравання банка аўтарскіх матэрыялаў. Трэба сказаць, спроба гэтая аказалася паспяховай. Адбыліся сустрэчы з настаўнікамі, вучнямі іншых школ горада, музейнымі работнікамі, выкладчыкамі Аршанскага гарадскога цэнтра творчасці дзяцей і моладзі.

У наступным навучальным годзе ўдзельнікі рэсурснага цэнтра дзяліліся вопытам работы па тэмах: "Выкарыстанне беларускага фальклору ў кантэксце сучасных тэндэнцый у мастацтве", "Фальклор у песнях і абрадах на сучасным этапе", "Праблема развіцця даследчыцкіх здольнасцей вучняў у галіне традыцыйнай культуры". Былі зроблены першыя даследчыя крокі па пытаннях традыцыйнай культуры: выканана і прадэманстравана навукова-даследчая праца па тэме "Жніўная абраднасць беларусаў: традыцыі і навацыі".

Выхаванне на прынцыпах этнапедагогікі ажыццяўляецца ў СШ № 15 па трох асноўных напрамках. Першы з іх музычны. Добра вядомы ў вобласці наш фальклорны калектыў "Сявенька", якому ў 2004 годзе прысвоена ганаровае званне "Узорны". Пераважную частку рэпертуару "Сявенькі" складаюць абрадавыя песні Аршанскага рэгіёна. У асноўным гэта акапэльныя спевы, якія нагадваюць аўтэнтычныя. Але гучаць песні з акампанементам. Пры інсцэніроўцы абрадавых свят спевы перамяжаюцца са скокамі, тэатралізаваным дзеяннем. Садзейнічае стварэнню канцэртных нумароў вялікая падрыхтоўчая работа: падрабязнае апытанне носьбітаў фальклору, запісванне песень асаблівасцей абрадавых дзей, менавіта ў нашым рэгіёне, вывучанне атрыманых звестак удзельнікамі фальклорнага калектыву і настаўнікамі.

У выніку гэтай карпатлівай працы настаўнікі прадметаў эстэтычнага цыкла назапасілі і запісалі, як на паперу, так і на электронныя носьбіты вялікую колькасць найкаштоўнейшых матэрыялаў. Гэта песні, замовы, легенды, паданні, побытавыя танцы, абрады ў выкананні носьбітаў фальклору. Ёсць у рэпертуары калектыву пазаабрадавыя беларускія народныя песні. Яны пастаянна гучаць на канцэртах у школе, у горадзе і за яго межамі. Такое ўдумлівае стаўленне да нацыянальнай спадчыны павышае культурны ўзровень вучняў, спрыяе іх патрыятычнаму выхаванню.

Другі напрамак выхавання на прынцыпах этнапедагогікі СШ № 15 – дэкаратыўна-прыкладны. Гэта саломапляценне, ткацтва бісерам, лазапляценне, біжутэрыя з дрэва, выцінанка і інш. Падчас пасяджэння рэсурснага цэнтра нашы настаўнікі праводзяць адпаведныя майстар-класы.

Трэці напрамак выхавання на падставе нашай нацыянальнай спадчыны – літаратурны. У школе створаны музей імя нашага земляка, вядомага беларускага байкапісца Уладзіміра Корбана. Традыцыйна ў СШ № 15 праводзіцца Тыдзень "Беларуская спадчына". Падчас яго ў вучняў і настаўнікаў ёсць магчымасць праявіць свае здольнасці ў розных відах і жанрах мастацтва, пазнаёміцца больш падрабязна з дзейнасцю розных калектываў і гурткоў школы. Так, у рамках такога Тыдня адбыліся выстава дзіцячага малюнка "Маляўнічая старонка", класныя гадзіны з наведваннем школьнага музея "Аршаншчына літаратурная", пазнавальна-забаўляльная праграма "Масленічныя стравы беларусаў". Удзел у гэтых мерапрыемствах прымаюць і бацькі вучняў, што дае магчымасць сфарміраваць сацыяльна-педагагічнае супрацоўніцтва ўсіх суб'ектаў адукацыйнага працэсу: вучняў, настаўнікаў, бацькоў.

Вучні школы пастаянна ўдзельнічаюць у розных гарадскіх, абласных і рэспубліканскіх конкурсах, фестывалях (гарадскі фестываль "Буду зоркай", абласны агляд-конкурс фальклорнага мастацтва дзяцей і моладзі "Ад прашчураў да зор", рэспубліканскі фестываль-конкурс








фальклорных калектываў “Таленты Беларусі” і інш.). Аб узроўні падрыхтоўкі нашых артыстаў сведчаць шматлікія граматы і дыпломы. Школа актыўна супрацоўнічае з мясцовым тэлебачаннем – аршанскім каналам “Скіф”.

Свой вопыт у выкарыстанні традыцый этнапедагогікі мы прадставілі на міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Роля культурнай спадчыны ў развіцці асобы, тэхналогіі арганізацыі пазавучэбнай, дзейнасці ў агульнаадукацыйнай школе”, якая прайшла на базе нашай установы адукацыі. Яе арганізатарамі разам з намі былі педагогі ліцэя № 5 г. Падольска Маскоўскай вобласці. Падчас канферэнцыі разглядаліся разнастайныя інавацыйныя падыходы да арганізацыі навукова-даследчай дзейнасці ў сучаснай школе, адбыўся абмен вопытам далучэння дзяцей да скарбаў музычнага фальклорнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Вяртаючыся да дзейнасці рэсурснага цэнтра “Дакраніся да вытокаў сваёй спадчыны”, з задавальненнем канстатуем, што колькасць яго ўдзельнікаў была павялічана. Гэта сапраўдныя прафесіяналы сваёй справы, для якіх неабыякавы лёс беларускай культуры, якія шчыра дбаюць пра сувязь пакаленняў, клапоцяцца пра духоўнае развіццё сваіх выхаванцаў, немагчымае без ведання ўласных каранёў і адчування годнасці за сваю нацыянальную прыналежнасць.

### Літаратура

1. Аляхновіч, А.М. Фальклор у выхаванні школьнікаў / А.М. Аляхновіч. – Мінск: ОДО “Четыре четверти”, 2008. – 195 с.

2. Ліцьвінка, В. Святы і абрады беларусаў / В. Ліцьвінка. – Мінск: Беларусь, 2001. – 188 с.

3. Лозка, А. Беларускі народны каляндар / А. Лозка. – Мінск: Полымя, 2002. – 237 с.